Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

Кафедра беларускага  і рускага мовазнаўства

Вучэбны матэрыял па тэме

# “ПРЫМЕТНІК.
# СЛОВАЎТВАРЭННЕ І ПРАВАПІС.”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

па дысцыпліне “Беларуская мова”
для спецыяльнасці:
1-01 01 01  Дашкольная адукацыя

Склала дацэнт Мордас Н.Р.

Мінск
2018

**ЗМЕСТ**

**1. Тэарэтычны раздзел**

1.1. Словаўтварэнне прыметнікаў. Афіксацыя

1.2. Утварэнне складаных прыметнікаў, іх правапіс

1.3. Марфалагічны разбор прыметніка

1.4. Тыповыя памылкі ў выкарыстанні формаў прыметніка

**2. Пытанні да самакантролю ведаў**

**3. Практычнаыя заданні**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## І. Тэарэтычны раздзел

### 1.1. Словаўтварэнне прыметнікаў. Афіксацыя

Прыметнікі ўтвараюцца рознымі спосабамі, але часцей суфіксальным, прыставачна-суфіксальным і асноваскладаннем.

Самым прадуктыўным спосабам ўтварэння прыметнікаў з'яўляецца ***суфіксальны***. Гэтым спосабам утвараюцца прыметнікі ўсіх трох разрадаў пераважна ад назоўнікаў і дзеясловаў пры дапамозе суфіксаў *-н-, -ск-, -лів-, -іст-, -ов-(-ав-)* і інш: *летні, аўтарскі, дажджлівы, жатраўлівы, галасісты, ганаровы, ласкавы.*

***Прыставачна-суфіксальным*** спосабам прыметнікі ўтвараюцца ад назоўнікаў, радзей ад дзеясловаў: *пілот – беспілотны, мяжа – бязмежны.*

### 1.2. Утварэнне складаных прыметнікаў, іх правапіс

[Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял “Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі”- Мінск, 2008 –144 с.]

Складаныя прыметнікі ўтвараюцца шляхам аб’яднаннем дзвюх ці трох асноў без дапамогі суфіксаў (***чыстае складанне***): *бела-ружовы зефір,беларуска-рускі слоўнік*, шляхам складання асноў пры дапамозе суфіксаў (***складана-суфіксальны спосаб***): *кароткачасовы, бульбаўборачны, іншамоўны* і шляхам ***зрашчэння*** кампанентаў словазлучэння ў адно слова: *глыбоканавуковы, высокамаральны.*

Пішуцца р а з а м прыметнікі:

- якія суадносяцца са складанымі назоўнікамі, што пішуцца разам: *чарназёмны* (чарназём), *водаправодны* (водаправод), *мастацтвазнаўчы* (мастацтвазнаўства), *іншаземны* (іншаземец), *радыёфізічны* (радыёфізіка), *жалезабетонны* (жалезабетон), *самаходны* (самаход), *хваляводны* (хвалявод);
- якія суадносяцца са словазлучэннямі з падпарадкавальнай сувяззю: *каменнавугальны* (каменны вугаль), *народнапаэтычны* (народная паэзія), *агульнаадукацыйны* (агульная адукацыя), *меднарудны,цэнтральнаеўрапейскі, цвёрдапаліўны уласнаручны,, круглагадовы,чырванабокі*;
- якія суадносяцца са словазлучэннямі дзеясловаў з назоўнікамі: *дрэваапрацоўчы* (апрацоўваць дрэва), *масларобны* (рабіць масла),

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*мукамольны* (малоць муку), *касцярэзны,кветкаводчы, водазаборны, ільноцерабільны, лесанарыхтоўчы, лёсавызначальны*;

- якія суадносяцца са словазлучэннямі назоўнікаў з лічэбнікамі і прыслоўямі адноснай меры колькасці, аб'ёму, прасторы і інш.: *двухразовы* (два разы), *трохколавы, двухтысячагадовы, сямісотпяцідзесяцігадовы, саракаградусны, пяцідзесяціпрацэнтны, саракатонны, шматразовы, мнагалюдны, усемагутны*;
- першай часткай якіх з'яўляюцца прыслоўі: *моцнадзеючы* (моцна дзейнічаць), *лёгкапаранены* (лёгка параніць), *цяжкаўс*в *прымальны* (цяжка ўспрымаць), *нізкарослы,высокаадукаваны,слабасалёны, добраўпарадкаваны, малапрыкметны;* але: *дыяметральна процілеглы* (супрацьлеглы), *чыста беларускі, яскрава вызначаны, выключна дасканалы, асабліва адказны, колькасна акрэслены, рэзка адмоўны, кепска ўзараны, усенародна абраны, выпадкова сустрэты, своечасова прыняты, адносна спакойны, бясконца глыбокі, матэрыяльна зацікаўлены*;
- складаныя прыметнікі з дзвюх і больш лексічных частак, якія служаць для абазначэння навуковых і тэхнічных паняццяў: *старажытнаўсходнеславянскі, правабярэжназаходнебугскі, старабеларускамоўны, індаеўрапейскі*.
-

Пішуцца п р а з з л у ч о к складаныя прыметнікі:

- утвораныя ад складаных назоўнікаў, якія пішуцца праз злучок: *вакуум-насосны, генерал-губернатарскі, унтэр-афіцэрскі, ліберал-дэмакратычны, давыд-гарадоцкі, санкт-пецярбургскі* і інш.;
- часткі якіх абазначаюць разнародныя назвы адпаведнай прыкметы: *прыродна-гаспадарчы, жыллёва-будаўнічы, аграрна-сыравінны, лячэбна-працэдурны, таварна-грашовы, электронна-вылічальны, навукова-тэхнічны, грамадска-палітычны, сусветна-гістарычны, народна-вызваленчы, сярэдне-верхні, прытарна-салодкі* і інш.;
- часткі якіх абазначаюць раўнапраўныя паняцці: *рабоча-сялянскі, руска-беларускі;*
- часткі якіх абазначаюць асаблівасці ці адценні разнароднай якасці: *кісла-салодкі, жоўта-зялёны, горка-салёны, гучна-пявучы* і інш.;
- часткі якіх абазначаюць напрамкі свету ў іх спалучэнні: *паўночна-заходні*;
- якія ўваходзяць у склад геаграфічных назваў з пачатковай часткай *Усходне-, Заходне-, Паўднёва-, Паўночна-, Цэнтральна-* і інш.: *Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка, Заходне-Сібірская раўніна, Цэнтральна-Азіяцкі рэгіён* і інш.;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- пачатковай часткай якіх з’яўляюцца лічба або літара любога алфавіта: *1000-гадовы, 5-павярховы, Т-падобны*.

Складаныя прыметнікі, утвораныя ад складаных уласных імёнаў са злучком, калі яны маюць прыстаўку, пішуцца р а з а м: *заісыккульскі, перадцяньшанскі*.

Складаныя прыметнікі з пачатковай часткай *ваенна-* пішуцца разам: *ваеннапалонны, ваеннапалявы, ваеннаабавязаны*

### 1.3. Марфалагічны разбор прыметніка

1. Слова ў тэксце.
2. Часціна мовы.
3. Пачатковая форма прыметніка (*Н.скл, адз. л, м.р.)*
4. Лексіка-граматычны разрад прыметніка: *якасны, адносны, прыналежны.*
5. Форма прыметніка (*поўная, кароткая*).
6. Ступень параўнання прыметніка (калі ёсць): *простая ці складаная формы вышэйшай ці найвышэйшай ступені параўнання.*
7. Форма ацэнкі і меры якасці прыметніка (калі ёсць).
8. Марфалагічныя прыметы: *род, лік, склон*.
9. Сінтаксічная сувязь з іншымі словамі ў сказе.
10. Сінтаксічная роля ў сказе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### 1.4. Тыповыя памылкі ў выкарыстанні формаў прыметніка

Найбольшую цяжкасць у выкарыстанні прыметнікаў выклікае ўтварэнне формаў:

- прыналежных прыметнікаў. Па аналогіі з рускай мовай утвараюцца памылковыя формы прыналежных прыметнікаў мужчынскага роду тыпу *Васіна машына, Пецін камп’ютар* ( руск.: *Васина машина, Пецин компьютер*). Трэба помніць, што ў беларускай мове такія прыметнікі ўтвараюцца пры дапамозе суфіксаў *-оў-(-ов-), -ёў-(-ёв-), -аў-(-ав), -еў-(-ев-): Васева машына, Пецеў камп’ютар.* Сустракаюцца памылкі і пры ўтварэнні прыналежных прыметнікаў жаночага роду: *Зоськіна мара, вавёркіна дупло*. У беларускай мове ў прыналежных прыметніках, утвораных ад назоўнікаў жаночага роду, заўсёды адбываецца чаргаванне *к//ч* у аснове: *Верчына мара*, *вавёрчына дупло*;

- ступеней параўнання якасных прыметнікаў. Пры ўтварэнні складанай формы найвышэйшай ступені займеннік *самы* памылкова далучаюць да простай формы вышэйшай ступені: *самы разумнейшы, самы цяплейшы*, у той час як нормы літаратурнай мовы патрабуюць спалучэння гэтага займенніка з прыметнікам без ступені параўнання: *самы разумны, самы цёплы.*Памылкі пры ўжыванні вышэйшай ступені параўнання выкліканы адсутнасцю правільнага суфікса, канчаткаў і прыназоўніка. Пад уплывам рускай мовы назвы прадметаў, у параўнанні з якімі вызначаецца мера якасці, ужываюць у форме роднага склону, прычым замет формы прыметніка выкарыстоўваюць форму прыслоўя: *брат разумней сястры*, *кава смачней гарбаты*. Нормы беларускай літаратурнай мовы патрабуюць у такіх выпадках выкарыстоўваць форму вінавальнага склону з прыназоўнікам **за**: *брат разумнейшы за сястру, кава смачнейшая за гарбату.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 2. Пытанні да самакантролю ведаў

1.. Назавіце прадуктыўныя спосабы ўтварэння прыметнікаў.
2. Ахарактарызуйце суфіксальны спосаб словаўтварэння прыметнікаў у беларускай мове.
3. У чым асаблівасці прыставачна-суфіксальнага спосаба словаўтварэння прыметнікаў?
4. Як утвараюцца складаныя прыметнікі?
5. Якія складаныя прыметнікі пішуцца разам?
6. У якіх выпадках складаныя прыметнікі пішуцца праз злучок?
7. Як пішуцца складаныя прыметнікі, першай часткай якіх з’яўляецца лічба?
8. Ахарактарызуйце паслядоўнасць марфалагічнага разбору прыметнікаў.
9. Назавіце тыповыя памылкі ў выкарыстанні формаў прыметнікаў.

## 3. Практычнаыя заданні

**Заданне 1.** Вызначце спосаб утварэння наступных прыметнікаў.

Праславуты, безбілетны, дапятроўскі, антываенны, Васеў, Алёнчын, унутрыгарадскі, наземны, кісла-салодкі, левабярэжны, паціметровы, вечназялёны, бульбяны, глыбокапаважаны, высокаадукаваны, падснежны, трохсотсямідзесяцікілаграмовы, недавараны.

**Заданне 2.** Вызначце, ад якіх слоў і якім спосабам утвораны прыметнікі.

Дабраякасны, няздатны, прыморскі, бязвокі, нясмачны, выпускны, цьмяны, дзядзькаў, сястрын, спакуслівы, жывучы, шыпячы (гук), свінны, любы, засціплы, прысядзібны, свежаспечаны, трохзменны, жалезабетонны.

**Заданне 3.** Вызначце, да якой часціны мовы належаць выдзеленыя словы. З некалькімі словазлучэннямі складзіце сказы.

Вучыць ***эсперанта***, заказаць ***мадэрн***, слухаць ***рок-музыку***, алей ***экстра***, размаўляць на ***хіндзі***, музыка ў стылі ***дыска***, паліто ***максі***, выступленне ***рокгрупы***, мода на ***дыска***, працаваць на ***цунамі***-станцыі, мова ***банту***, захапляцца познім ***барока***, шаль колеру ***марэнга***, іграць ***рок***, нумар ***люкс***, масла ***экстра***, шпалеры колеру ***беж***, апрануцца ў ***хакі***, заказаць сабе ***люкс***, насіць ***міні***, санаціна для скрыпкі ***сола***, касцёл у стылі ***ракако***, ***комі*** літаратура, складанае ***сола***, ***плісэ*** выйшла з моды

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Заданне 4.** Прачытайце. Вызначце, якімі часцінамі мовы і членамі сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы?

1. Дзве дарожкі, дзве сцяжынкі, дзве сцяжынкі, як істужкі, да ***каханае*** дзяўчынкі ўюцца дужкай (А.Мілюць). 2. Свет тваіх зачакаўся балядаў: не саромься, давай, ***сінявокі*** (А. Хадановіч). 3. Можа яна дойдзе, калі пачнуць кананізаваць не ў ***святыя***, а ў людзі (У. Караткевіч). 4. ...Тут куточак такі ***мілы***, так ён добра паслужыў (Якуб Колас). 5. Хто ў гэтым ***вінаваты*** – вядома добра і табе і мне (Н. Гілевіч). 6. Зноў ***маладая*** кроў узыгралася, бы мора (А.Мілюць). 7. Хто шнур зжуе няроўным плехам – Антось яго ўжо дойме смехам, задзене проста за ***жывое***, хоць сэрца ў дзядзькі і не злое (Якуб Колас). 8. Чакаць, калі ты прыляціш, калі свае спаволіш крылы, каб пацалункам поўніць ціш, каб прашаптаць святое "***мілы***"? (М. Шабовіч). 10. І тады Хрыстос моцным ударам нагі скінуў уніз адну фігурку ***святога***, вялікі вулей з доўбленай ліпы (У. Караткевіч). 11. ***Простае*** нашых прадзедаў слова, хоць апаганена мудрым чужынцам, шлі, ідзём далей улева ці ўправа – простым гасцінцам (Янка Купала). 12. ***Мудрэйшыя*** кажуць: на выпрабаванні – не мы, а сусветы, замкнёныя ў нас (Т. Бондар). 13. Як ***сляпыя*** ўначы – хто куды два чужыя пайшлі чалавекі (М. Шабовіч). 14. А вось маёй адсталасці прычына -- ***прыёмны*** мой пакой, мая дзяржава – кухня, дзе пры цяпельцы ў дзежцы цеста пухне (Д. Бічэль-Загнетава). 15. Нехта дужы, і **смелы**, і горды расчасаў па загонах чупрыны (А.Мілюць). 16. Хата жывая, пакуль ***маладое*** гадуецца ў ёй (Р. Барадулін). 17. Ён з'явіцца, ***жаданы*** хтосьці, як даўні і

чаканы госць (І. Багдановіч). 18. Як аслупянелы, ***стары*** доўга стаяў на адным месцы, пакуль стаў заўважаць адзнакі таго, што жыццё бяжыць (Кузьма Чорны). 19. Ціха праходзіце вы, як ***жывыя***, ззяючы мілай красой (Якуб Колас). 20. Расклаўшы вогнішча хачу я начлег ***мінулы*** ўспамінаць (Міхась Чарот). 21. Памылкі прывядуць цябе ў адчай – ***чужога*** выхаду не пазычай (Д. Бічэль-Загнетава). 22. ***Трапезная*** мечаносцаў размяшчалася якраз пад пакоем, у якім жыў гросмайстар (Л. Дайнека). 23. Незразумелы мне арганум узбагачаў мой ***бедны*** слых: "Як пакахаеш, то каханым ты станеш на адзін уздых" (Л. Дранько-Майсюк). 24. Кожны 89 чацвёрты быў ***мёртвы***. Мір і спакой ім вечны! (А. Вярцінскі). 25. ***Незвычайнае*** ў яго мове адразу здзівіла мяне і зацікавіла (А. Гарун).

**Заданне 5.** Утварыце складаныя прыметнікі. Растлумачце іх правапіс

Тры кілаграмы, здольны да працы, літаратурны і музычны, Новы год, Далёкі Усход, дзесяць гадоў, шахматны і шашачны, рэгіён Заходняга Палесся, шэрыя вочы, розныя колеры, белы і ружовы, шырокі экран, шмат ступеняў, глыбокая вада, Лацінская Амерыка, трыста пяцьдзясят шэсць кіламетраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Заданне 6.** Растлумачце правапіс прыметнікаў.

Палескі, данбаскі, каўказскі, грамадскі, студэнцкі, фашысцкі, кузнецкі, нясвіжскі, пухавіцкі, смалявіцкі, добрушскі, рыжскі, чыкагскі, брандэнбургскі, латарынгскі, мастацкі, рыбацкі, беластоцкі, н'ю-йоркскі, бангкокскі, чэшскі, казахскі, сцюдзёны, юны, драўляны, сярэбраны, палымяны, безымянны, студзеньскі, любанскі, Чэрвенскі (раён), кампостны, кантрастны, водаправодны, вечназялёны, высокакваліфікаваны, дзікарослы, шчыра сказанае (слова), навукова абгрунтаваны (план), беспрацэнтнавыйгрышная пазыка, давыд-гарадоцкі, масквАрэцкі, грамадска-палітычная дзейнасць, Паўночна-Ціхаакеанскае цячэнне, палітыка-масавы, паўночназаходні.

**Заданне 7.** Зрабіце марфалагічны разбор выдзеленых слоў.

Самыя раннія – ***веснія*** воды, самыя познія – цені змяркання, самыя лёгкія – шчасныя годы, самыя цяжкія – слёзы расстання, самыя ціхія – сцежкі дубровы, **самыя звонкія** – родныя гукі, самыя чэрствыя – ***крыўдныя*** словы, самыя чулыя – матчыны рукі, ***найсаладзейшыя*** – у лесе маліны, а найгарчэйшыя – дні на чужыне. (М.Т.)